АБСОЛЮТБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2018 г.

Наименование банка ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2018	01.01.2018
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	9 695	8 677
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	17 924	13 340
5	Средства в банках	1104	8 671	26 292
6	Ценные бумаги	1105	14 349	17 704
7	Кредиты клиентам	1106	39 652	53 453
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	11	11
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	7 239	7 611
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	152	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	2 451	1 981
13	Отложенные налоговые активы	1112	6	7
14	Прочие активы	1113	2 435	3 292
15	**ИТОГО активы**	**11**	**102 585**	**132 368**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	3 181	8 655
19	Средства клиентов	1203	31 326	53 218
20	Ценные бумаги банка	1204	12 181	15 614
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	347	670
24	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**47 035**	**78 157**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	39 331	39 331
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	2 651	805
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	3 366	3 367
30	Накопленная прибыль	1215	10 202	10 708
31	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**	**55 550**	**54 211**
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**	**102 585**	**132 368**

ОТЧЕТ
О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
на 1 октября 2018 г.

Наименование банка ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2018	01.10.2017
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	5 975	6 530
2	Процентные расходы	2012	982	1 579
3	Чистые процентные доходы	201	4 993	4 951
4	Комиссионные доходы	2021	734	735
5	Комиссионные расходы	2022	551	503
6	Чистые комиссионные доходы	202	183	232
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	298	182
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	4 280	3 302
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	1 512	450
12	Прочие доходы	208	496	377
13	Операционные расходы	209	7 003	6 861
14	Прочие расходы	210	64	60
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	1 671	1 673
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	331	134
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**1 340**	**1 539**

Руководитель В.И. Вашкевич

Главный бухгалтер О.С. Турбина

Дата подписания: 4 октября 2018 г.

Отчетность о деятельности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» в полном объеме размещена на сайте www. absolutbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 9 от 06.09.2017. УНП 100331707

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13

Предмет аукциона (одним лотом)

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (номер дома)
Месторасположение предмета аукциона: Минская обл., Слуцкий р-н, **г. Слуцк**, ул. Максима Богдановича			
Здание кирпичное	40,4 кв. м	640/С-84557	д. 136А/1
Здание склада	286 кв. м	640/С-84559	д. 136А/2

Сведения о земельном участке: пл. 0,1009 га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий. Ограничения прав: водоохранная зона реки Случь, площадь 0,1009 га

Начальная цена с НДС 20 % – 36 416,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.08.2018

Дата и время проведения аукциона: 15.11.2018 в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.11.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Таямніцы Друцкага кургана

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Гэтыя знаходкі былі зроблены намі яшчэ ў 2009 годзе ў Друцку. Напярэдадні я працавала там на працягу некалькіх палявых сезонаў (і прайшло 35 гадоў з таго моманту, як скончыў раскопкі маскоўскі археолаг Аляксееў, а ён капаў каля 10 сезонаў; таму шмат матэрыялу знаходзілася ў Расіі).

Спачатку я раскапала гарадзішча, таксама навакольны горад, пасад і курганны могільнік — захаваўся адзін падоўжаны курган, на які мы асаблівых надзей не ўскладалі. Але ўсё-такі ўскрылі яго, і там нас напаткала вялікая нечаканасць. У адным кургане выявілася 38 пахаванняў — гэта было калектыўнае пахаванне, прычым зробленае ў чатыры слаі.

Самае ніжняе пахаванне — у труне пад каменнай плітой, апушчанай у зямлю, — зроблена па хрысціянскім абрадзе. Надмагільная пліта ляжала наверсе, вакол яе — некалькі шкілетаў людзей дастаткова высокага росту, з сечанымі ранамі на касцях. З каўнярамі візантыйскага шыцця, вытканымі залатымі ніткамі, з пазалочанымі гузікамі. Гэта былі людзі дастаткова знатныя. Іх перакрываў слой зямлі, і зверху ляжала, атрымліваецца, ужо трэцяя ступень пахавання. Там былі і жаночыя, і дзіцячыя, і мужчынскія пахаванні, але шараговыя. Па наканечніках стрэл, якія захраслі ў касцях людзей гэтых абодвух радоў пахавання, было бачна, што яно змяшчае вынікі бітвы. Гэты пласт таксама перакрылі слоем глебы. З самага верху знаходзіліся пахаванні рабоў (ёсць некаторыя прыкметы, па якіх мы зазвычай выдзяляем такія пахаванні ў адносінах да іншых сацыяльных слаёў). А сама надмагільная пліта была выкананая з вапняку ў выглядзе падоўжанага шчыта. Пліту разам з дзвюма падстаўкамі, на якіх яна стаяла, мы перадалі ў Віцебскі краязнаўчы музей (яе можна ўбачыць у экспазіцыі).

«Самае адметнае, што адзіным, зробленым па хрысціянскай традыцыі, было пахаванне маленькага княжыча, а ўсе астатнія — па паганскім звычаі».

У магіле быў выяўлены чэрап дзіцяці, некалькі невялікіх костачак і адзін пазалочаны гузік. Драўляны тлен контурам паказвае, што там ляжала драўляная труна. Мы аддалі чэрап на даследаванне, і па ім аднавілі воблік дзіцяці — яму было паміж 4 і 6 гадамі. Затым зрабілі адліўку галавы — вынік можна пабачыць у музеі Інстытута гісторыі.

Адшукаўшы гэту пліту і перадаўшы яе ў музей, я пачала гартаць спецыялізаваную літаратуру. І зразумела, што аналагічныя надмагільныя пліты былі знойдзены ў княскіх пахаваннях у Галіцка-Валынскай зямлі. Гэтыя пліты былі прывезены з Візантыі. А нашы полацкія князі ў XII стагоддзі былі таксама сасланыя ў Візантыю — і там праходзілі вайсковую службу. У 1140-х гадах яны вярнуліся на радзіму — натуральна, што прывезлі з сабой адзенне (тканіны візантыйскага ўзору, як ужо згадвалася, былі на каўнярах у пахаваннях), і пліту, і, пэўна, загатоўкі пліт.

Мы зрабілі выснову, што ў гэтым кургане быў пахаваны прадстаўнік княжацкай дынастыі са сваёй світай — і з людзьмі, якія складалі яго дружыну, і дружыннае атачэнне, таксама з тымі, хто быў яго вольнай абслугай і рабамі. Усе размяшчаліся ў адпаведнай градацыі. І самае адметнае, што адзіным, зробленым па хрысціянскай традыцыі, было пахаванне маленькага княжыча, а ўсе астатнія — па паганскім звычаі. І княжыч усё адно ляжыць у кургане, які з'яўляецца паганскім спосабам пахавання. Калі прыйшло хрысціянства, гэты абрад пачаў адміраць, і ўжо ў канцы XIII стагоддзя рабіліся грунтавыя пахаванні без курганоў.

Надмагільная пліта.

«З каўнярамі візантыйскага шыцця, вытканымі залатымі ніткамі, з пазалочанымі гузікамі. Гэта былі людзі дастаткова знатныя».

Вяліліся размовы, хто гэта такія, чаму адначасова пахавана 38 чалавек, з чым гэта можа быць звязана?.. Я пачала вывучаць дакументальныя матэрыялы, летапісы, аналізуючы рэчыўны матэрыял, знойдзены ў кургане, і пабачыла, што гэта курган другой паловы XII стагоддзя. А па летапісных звестках было зафіксавана, што ў 1151 годзе мінскі князь Расціслаў Глебавіч шляхам інтрыг звергнуў з полацкага прастола свайго стрыечнага брата друцкага князя Рагвалода Барысавіча і пазбавіў яго і яго дружыну «жыцця», як было напісана ў летапісе. У той час пад «жыццём» мелася на ўвазе маёмасць. Гэта значыць, ён разрабаваў Друцкую воласць і пасадзіў там аднаго са сваякоў. А мясцовы князь апынуўся ў выгнанні, ён папрасіў дапамогі ў чарнігаўскіх сваякоў. Тыя прыйшлі, і ў 1158 годзе адбылася міжусобная бітва паміж друцкім князем і мінскімі князямі, якія занялі яго тэрыторыю. Напісана, што бітва была крывавая. Пасля гэтага мінскія князі зноў былі вернуты ў Мінскую зямлю. Палачане прыйшлі да друцкага князя і сказалі: «Княжа, мы перад табой вінаватыя. Мы цяпер гатовыя схапіць мінскага князя і пасадзіць яго ў лёхі ці аддаць у твае рукі — рабі з ім што хочаш. А ты вярніся назад на прастол у Полацк». Што ён і зрабіў, вярнуўся назад на княжанне.

Невядома, якія меры былі прынятыя да якіх князёў, але застаецца факт, што была бітва. І вось пытанне: хто быў пахаваны ў друцкім кургане? Гэта прадстаўнікі друцкага князя, яго атачэнне, ці прадстаўнікі мінскага князя? Пра дзяцей у летапісах зазвычай нічога не пішуць, калі гэта не мае нейкага прынцыповага значэння.

Разам з Андрэем Вайцяховічам, які таксама капаў гэты курган, мы паглядзелі на апоры, на якіх ляжала каменная пліта, на адной з іх ёсць высечаны знак. Ён падобны на крыж з выявы знака мінскіх князёў. Мы зрабілі верагодную выснову, што гэта маглі быць мінскія князі, якіх перамог друцкі князь, вярнуўшы сабе маёмасць і княства. Але паколькі яны родныя і размова вядзецца пра загінулага княжацкага прадстаўніка, то пахаванне адбылося па княжацкай традыцыі, па ўсіх правілах.

«У адным кургане выявілася 38 пахаванняў — гэта было калектыўнае пахаванне, прычым зробленае ў чатыры слаі».

Усе князі былі хрышчоныя, таму дзіця паклалі па хрысціянскім абрадзе. Але паколькі паганскі дух захоўваўся нават у княжацкім асяроддзі даволі трывала, то ўся світа разам з князем былі пахаваныя пад курганом.

Так і атрымліваецца, што калі дзіця з'яўляецца сынам Расціслава Глебавіча ці яго родных братоў па лініі мінскіх князёў (а Глеб быў сынам Усяслава Полацкага), то малы з'яўляецца прапраўнукам Усяслава. Другое пытанне, хто гэта быў — прадстаўнік мінскага роду ці друцкага роду Усяславічаў?

У самым версе насыпу, які перакрыў усё, мы знайшлі свінцовую пячатку. Гэта выява візантыйскіх князёў святых Канстанціна і Алены. Гэта яшчэ адно сведчанне таго, што з Візантыі было прывезена шмат рэчаў пасля вяртання са ссылкі. Можа, пячатка трапіла туды выпадкова, а можа, яе наўмысна кінулі ў курган, калі закрывалі яго, з рытуальнай мэтай.

Надмагільная каменная пліта захоўваецца ў віцебскім музеі. Бачны знак — крыжык і двузубец. У мінскіх князёў уверсе на адным з зубцоў быў такі ж крыжык. І тое дае нам магчымасць меркаваць, што гэта былі ўсё-такі мінскія князі».

Пахаванне прапраўнука Усяслава Чарадзея.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.